WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 ВЕРАСНЯ 2011 г.
АЎТОРАК
№ 174
(27038)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

МІНІМАЛЬНАЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА Ў БЕЛАРУСІ ЗА ЖНІВЕНЬ ІНДЭКСУЕЦЦА НА 51,4 ПРАЦЭНТА І СКЛАДАЕ BR687 ТЫС. 370

У Беларусі мінімальная заработная плата за жнівень 2011 года індэксуецца на 51,4 працэнта, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Паводле слоў спецыялістаў, гэта тлумачыцца тым, што індэкс спажывецкіх цэн за жнівень перасягнуў пяціпрацэнтны парог да чэрвеня гэтага года — моманту папярэдняй індэксацыі. Такім чынам, месячная мінімальная заработная плата за жнівень гэтага года складае Br687 тыс. 370, пагадзінная мінімальная заработная плата — Br4 тыс. 50.

З 1 студзеня гэтага года памер мінімальнай заработнай платы, устаноўлены пастановай урада, склаў Br460 тыс. Гэты нарматыў у красавіку (з улікам індэксацыі 9,3 працэнта) павялічыўся да Br491 тыс. 920, у маі (з улікам індэксацыі 23,7 працэнта) — да Br541 тыс. 350, у чэрвені — да Br577 тыс. 740 (з улікам індэксацыі 34,3 працэнта), у ліпені — да Br611 тыс. 730 (з улікам індэксацыі 34,3 працэнта).

У адпаведнасці з законам «Аб устанаўленні і парадку павышэння памеру мінімальнай заработнай платы» памер МЗП, устаноўлены заканадаўствам і праіндэксаваны, з'яўляецца абавязковым для наймальніка ў якасці ніжэйшай мяжы аплаты працы работнікаў.

БОЛЬШ ЯК BR370 МЛН ВЫДЗЕЛЕНА СА СПЕЦФОНДУ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ НА ПАДТРЫМКУ ТАЛЕНАВІТАЙ МОЛАДЗІ

На заахвочванне творча адораных прадстаўнікоў маладога пакалення і стварэнне ўмоў для развіцця іх здольнасцяў са спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі выдзелена Br373,193 млн. Аляксандр Лукашэнка 8 верасня сваім распараджэннем зацвердзіў рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

З гэтых сродкаў па рашэнні Прэзідэнта будзе назначана 22 стыпендыі, выплачаны 17 прэмій, 16 заахвочвальных прэмій і 4 гранд-прэміі фонду лаўрэатам міжнародных і нацыянальных фестываляў і конкурсаў, аказана матэрыяльная дапамога двум актыўным удзельнікам мастацкатворчых мерапрыемстваў на агульную суму Br64,89 млн.

Кіраўнік дзяржавы падтрымаў таксама прапановы савета фонду аб выдзяленні Br83,68 млн Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў на набыццё сцэнічных касцюмаў і музычных інструментаў для вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Валачобнікі», Br55,59 млн — аддзелу культуры Гродзенскага райвыканкама на набыццё сцэнічных касцюмаў і музычных інструментаў для заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танца «Лялечкі» Абухаўскага цэнтра культуры і вольнага часу Гродзенскага раёна. Акрамя таго, будзе выдзелена Br89,033 млн Беларускаму дзяржаўнаму ансамблю «Песняры» на набыццё музычнага абсталявання для Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя У.Г. Мулявіна, Br80 млн — Рэспубліканскай гімназіі-каледжу пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі на набыццё музычных інструментаў.

Як адзначылі ў прэс-службе, прыняцце распараджэння Прэзідэнта Беларусі дасць магчымасць забяспечыць адрасную дзяржаўную падтрымку лепшых прадстаўнікоў таленавітай моладзі, стварыць спрыяльныя ўмовы для творчага росту юных талентаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АДЗНАЧАЕ ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНЫХ І ПАЛІТЫЧНЫХ АДНОСІН ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І АРМЕНІЯЙ

Беларусь і Арменія дасягнулі высокага ўзроўню ў развіцці гандлёва-эканамічных і палітычных адносін. Аб гэтым учора заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Арменіі Эдвардам Налбандзянам, перадае БЕЛТА.

«Самыя інтэграцыйныя дзяржавы постсавецкай прасторы — гэта нашы дзве краіны, у выніку розных прычын, аб'ектыўных і суб'ектыўных», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, Беларусь і Арменію звязвае цеснае эканамічнае супрацоўніцтва, якое за апошнія гады ўдалося вывесці на даволі высокі ўзровень. «Некалькі гадоў таму гэтых адносін не было наогул і цяжка было сабе ўявіць, што мы можам выбудаваць гэтыя адносіны. Свет не без добрых людзей, не без варыянтаў, мы знайшлі гэтыя шляхі супрацоўніцтва, бізнэсменаў, якія ўзначалілі гэты працэс», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

У частцы палітычнага супрацоўніцтва Прэзідэнт падкрэсліў, што яно на вельмі высокім узроўні, паколькі абедзве краіны знаходзяцца ў адным ваенна-палітычным блоку. «Так, ёсць шурпатасці, але для таго і сённяшняя ваша сустрэча з міністрам замежных спраў Беларусі, каб пазбегнуць гэтых шурпатасцяў у будучым і выбудаваць адносіны ў тым ліку на міжнароднай арэне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, ён адзначыў, што абедзве краіны звязваюць дружалюбныя адносіны не толькі на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, але і ўрадаў, прадстаўнікоў бізнэсу. «Мы вельмі перажываем за тое, як жыве наш брацкі армянскі народ, як ён развіваецца, радуемся вашым поспехам, пачынаючы са спартыўных і заканчваючы поспехамі ў эканоміцы, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Радуемся таму, як вы спрабуеце ў складаных умовах не проста выжыць, а вывесці Арменію на больш высокі ўзровень развіцця. Калі мы можам быць у гэтых адносінах чымсьці карысныя, мы гэта зробім».

У сваю чаргу кіраўнік МЗС Арменіі Эдвард Налбандзян адзначыў, што ў ходзе яго цяперашняга візіту ў Беларусь плануецца абмеркаваць шэраг пытанняў як двухбаковых, так і пытанняў рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня. «Мы на самым высокім узроўні падтрымліваем палітычны дыялог», — падкрэсліў міністр замежных спраў Арменіі, адзначыўшы, што ўсебаковае развіццё супрацоўніцтва ідзе даволі паспяхова, а пытанні, якія ўзнікаюць, аператыўна вырашаюцца. Ён таксама паведаміў, што ў ходзе яго візіту знешнепалітычныя ведамствы Беларусі і Арменіі плануюць падпісаць план супрацоўніцтва на 2011—2012 гады.

Беларусь з'яўляецца важным гандлёвым партнёрам Арменіі, займаючы па аб'ёме ўзаемнага гандлю трэцяе месца сярод краін СНД. Па выніках 2010 года экспарт беларускай прадукцыі ў Арменію склаў $42,1 млн (узрос на 81,2 працэнта). Асноўныя экспартныя пазіцыі ў гандлі з Арменіяй — шыны, грузавыя аўтамабілі, трактары, а таксама часткі і прылады да іх, лякарствы, малочныя прадукты харчавання і інш. Аснову імпарту з Арменіі складаюць мацыя спіртныя напоіткі, тытунёвыя вырабы, хімічныя рэчывы і лекавыя сродкі. У Арменіі сфарміравана ўласная тавараправодная сетка беларускіх прадпрыемстваў, адкрыты 3 прадпрыемствы з удзелам беларускага капіталу: ЗАТ «Гандлёвы дом «БелАр», ТАА «БелАЗ Каўказ Транс Сэрвіс» і ТАА «Армяна-Беларускі гандлёвы дом «Ар-Бе».

Больш увагі спажывецкаму рынку

Прэм'ер-міністр Беларусі запатрабаваў ад мясцовых улад больш актыўна займацца праблемамі ўнутранага спажывецкага рынку. Аб гэтым ён заявіў 9 верасня падчас наведвання Мінскага камбіната хлебапрадуктаў, перадае БЕЛТА.

«У тых рэгіёнах, якія актыўна займаюцца спажывецкім рынкам і глядзяць, каб былі і крупяныя, і макаронныя вырабы, мясныя прадукты, няма праблем», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. У той жа час у асобных рэгіёнах не сочаць за тым, што ёсць на паліцах магазінаў і што купляецца. «Нашым губернатарам, мэрам гарадоў неабходна больш увагі надаваць гэтаму пытанню, — упэўнены прэм'ер-міністр. — Трэба, каб яны больш актыўна займаліся праблемамі ўнутранага спажывецкага рынку».

БУДЗЕМ З ЎЛАСНАЙ ГРЭЧКАЙ...

Сёлета ўнутраны рынак Беларусі будзе поўнасцю забяспечаны грэчкай айчыннай вытворчасці, заявіў журналістам прэм'ер-міністр.

«У нас у гэтым годзе будзе 58 тыс.т, а можа, і 60 тыс.т грэчкі, — сказаў прэм'ер-міністр. — Гэтага дастаткова для таго, каб забяспечыць унутраны рынак грэчкай, якой нам трэба 25 тыс.т».

У цэлым патрэбнасці ў крупяных вырабах унутранага рынку краіны ацэньваюцца ў 80 тыс.т. Міхаіл Мясніковіч запэўніў, што ніякіх праблем па задавальненні попыту на крупяныя культуры не будзе. У прыватнасці, на «Брэстхлебапрадуктах» запушчаны сучасныя магутнасці па выпуску проса айчыннай вытворчасці на 6 тыс.т. «Патрэбнасці ў нас — 7 тыс.т, і яны практычна поўнасцю будуць задаволены, а раней нашага проса не было наогул, хоць гэта традыцыйная для нас культура, проста гэтым ніхто не займаўся», — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч.

Кіраўнік урада таксама падкрэсліў, што беларускія вытворцы павінны задаволіць патрэбнасці ўнутранага рынку і ў аўсяных вырабах. «Гэта закрыецца поўнасцю, такім чынам, па ўсіх крупяных культурах не павінна быць праблем з насычэннем унутранага рынку», — сказаў ён.

Міхаіл Мясніковіч таксама звярнуў увагу Мінсельгасхарча і дэпартамента па хлебапрадуктах на неабходнасць вытворчасці вялікай колькасці паўфабрыкатаў. «Мала робіцца такой прадукцыі — гатовых сняданяў, сумесяў, якія можна хутка згатаваць», — канстатаваў ён. Вытворцы павінны больш актыўна вырашаць гэтыя пытанні.

Прэм'ер-міністр таксама дадаў, што ў пакупнікоў заўсёды павінен быць выбар: набываць дарагую або танную прадукцыю. «Калі хтосьці любіць імпартнае, няхай купляе дарагое, але наша прадукцыя па якасці ў прынцыпе адпавядае еўрапейскай і пры гэтым значна таннейшая», — рэзюмаваў кіраўнік урада.

...І З УЛАСНЫМ АБУТКАМ

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў ад арганізацый гарбарнай галіны забяспечыць абутковую прамысловасць уласнай сыравінай.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.09.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	5 347,00	1 чэшская крона	297,48
▼ 1 еўра	7 255,34	1 польскі злоты	1 684,60
1 латвійскі лат	10 261,97	▼ 1 расійскі рубель	176,45
1 літоўскі літ	2 107,15	1 украінская грыўня	668,17

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанк РФ

USD	30,3034
10 UAH	37,9148
10000 BYR	57,4799
EUR	41,0914

Агенцтва урадавага грамадзянства

На свае вочы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МІНСКУ — 944:

асілкі, графіці і вулічныя музыкі. І Памяць

ГЭТЫЯ два дні, якія мы пражылі ў выхадныя, увабралі ў сябе столькі, што ў іншы час хапіла б на некалькі. Знямелая ад болю краіна сцішылася, праводзячы ў апошні шлях трох маладых таленавітых беларусаў, чыё жыццё абарвалася ў самым росквіце. Тысячы мінчан, жыхароў іншых куточкаў краіны плакалі разам з роднымі членаў каманды яраслаўскага «Лакаматыва», якой у адно імгненне не стала. Мяняліся планы і распарадкі, карэктаваліся сцэнарыі. Штосьці дадавалася, штосьці пераносілася. Усё ж жыццё не спыняецца. Дзень горада атрымаўся такім, якім атрымаўся — шматаблічным, розным па настроі. Наш дзень, якім варта даражыць.

Мэр Мінска Мікалай Ладуцька падчас ускладання кветак да абеліска «Мінск — горад-герой» зазначыў, што Мінск — горад з моцнай сілай духа.

— Мы сабраліся сёння тут, каб аддаць даніну пашаны ўсім пакаленням мінчан, усім людзям, якія на працягу соцень гадоў рабілі ўсё для таго, каб горад быў. Мы ўсе аб'яднаныя адзіным пачуццём, адзіным імкненнем жыць у цудоўным, самым лепшым горадзе на планеце.

У той жа дзень адбылося ўрачыстае адкрыццё канцэртнай залы дзіцячай філармоніі «Верхні горад». Зала размешчаная ў будынку адноўленай царквы Святога Духа. Царкву, якая існавала ў Мінску з XVII стагоддзя і якая была знішчаная ў 1937-м, аднаўлялі паводле малюнка невядомага мастака XIX ст.

Як стала вядома «Звяздзе», акрамя прамога прызначэння, дзіцячую філармонію будуць выкарыстоўваць і як пляцоўку для заключэння шлюбаў — ЗАГС Кастрычніцкага раёна сталіцы ўжо арганізаваў першыя вяселлі...

ПУНКТУАЛЬНАЕ СВЯТА

Мерапрыемствы ля Палаца спорту і Нацыянальнай бібліятэкі нагадвалі карціну, бачаную ўжо дзясяткі разоў. Пах шашлыкоў, спевы народных калектываў, дзеці ў вазках і балонікі.

СТАР. 3

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вуліцы К. Маркса і Камсамольская ў Мінску праз два гады стануць пешаходнымі

Аб гэтым паведаміў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька на аператыўнай нарадзе ў мэрыі, перадае БЕЛТА.

«Да канца 2013 года, перад чэмпіянатам свету па хакеі, вуліцы К. Маркса і Камсамольская павінны напоўніцца «адпаведным узроўнем і зместам». Мэр Мінска даручыў прапрацаваць варыянты рэалізацыі праекта з уладальнікамі адміністрацыйных і жылых памяшканняў. Паводле яго слоў, неабходна максімальна ўлічыць інтарэсы жыльцоў, якія пражываюць на першых паверхах дамоў. «Не трэба адразу адсяляць жыльцоў. Гэта павінна быць мяккім, але рашучым варыянтам», — звярнуўся старшыня Мінгарвыканкама да кіраўніцтва адміністрацый раёнаў горада.

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» с 13 сентября 2011 года устанавливает следующий размер процентов по вновь привлекаемым депозитам физических лиц в белорусских рублях:

Наименование депозита	Срок привлечения	Размер процентов (годовых)
«Праздничный»	65 дней	33
«Актуальный»	6 месяцев	34,5

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:

- 148 (в стационарной сети);
- МТС (029) 5-148-148, 2-148-148; Velcom (044) 77-00-148, 77-55-148.

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2010 г. (млрд. руб.): январь – 6,1; февраль – 6,3; март – 7,3; апрель – 6,6; май – 6,9; июнь – 7,0; июль – 7,3; август – 8,1; сентябрь – 7,6; октябрь – 7,1; ноябрь – 7,2; декабрь – 6,5.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 08.06.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

ВУП Беларусі за студзень—жнівень узрос на 9,1 працэнта да Br155,1 трлн

Аб'ём валавога ўнутранага прадукту Беларусі ў студзені—жніўні гэтага года ўзрос на 9,1 працэнта ў параўнанні з узроўнем аналагічнага перыяду мінулага года да Br155,1 трлн, паведаміла БЕЛТА прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка.

Згодна з прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011 год, тэмп росту ВУП павінен скласці 109-110 працэнтаў да адпаведнага ўзроўню 2010 года.

Вытворчасць прамысловай прадукцыі за студзень—жнівень гэтага года ўзрасла на 11 працэнтаў і склала Br174,6 трлн (гадавы прагноз росту — на 9-9,5 працэнта). Удзельная вага адгружанай інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме адгружанай прадукцыі склала 16,9 працэнта пры гадавым прагнозным значэнні гэтага паказчыка — 12-13 працэнтаў.

Аб'ём інвестыцый у асноўны капітал у студзені—жніўні гэтага года склаў 118,9 працэнта да аналагічнага ўзроўню мінулага года пры гадавым прагнозе 116-117 працэнтаў.

У жыроўках мінчан асобным радком могуць выдзеліць аплату святла ў пад'ездзе

Мінгарвыканкам накіраваў у Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі прапанову аб устанаўленні для насельніцтва аплаты за святло ў месцах агульнага карыстання жылых дамоў. Аб гэтым паведаміў генеральны дырэктар ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Уладзімір Раянтовіч на аператыўнай нарадзе ў гарвыканкаме, перадае БЕЛТА.

У прыватнасці, прапануецца ўнесці змяненні ў тэхпашпарт жыльцоў, у якім была б вызначана доля ўласнасці месцаў агульнага карыстання. Такім чынам, у жыроўцы можа з'явіцца асобны радок па аплаце святла ў месцах агульнага карыстання. Канчатковае рашэнне па гэтым пытанні — у кампетэнцыі ўрада.

«ЗВЯЗДА» Ў ЧАШНІКАХ

У мінулую суботу ў невялікіх, але вельмі ўтульных і гасцінных Чашніках святкавалі Дзень горада. «Звязда» таксама прыняла ўдзел у святкаванні

Ехаў, як належыць, з падарункамі. Па-першае, трэба было адзначыць трох паштальёнаў з Чашніцкага раёна, якія перамаглі ў спаборніцтве па падпісцы на нашу газету. Па-другое, да чытачоў таксама без падарункаў нельга.

На жаль, Васіль Максімовіч, Галіна Дземянцей і Мікалай Запаро, у якіх быў самы вялікі прырост тыражу, нягледзячы на свята працавалі і прыйсці на галоўную плошчу горада па свае прызы не змаглі. Перадаць падарункі ад «Звязды» паштальёнам ахвотна згадзілася начальнік Чашніцкага РУПС Алена Біцяй.

Пасля таго, як доўг перад паштавікамі быў выкананы, стаў раскладваць за сталом пасярод плошчы звяздоўскія сувеніры. Прыгожыя календары, пяшчотнае «Да чытача — з любоўю» на нататніках хутка прыцягнулі ўвагу гараджан і гасцей свята. Усіх вельмі здзіўляла «валюта», за якую можна было гэта ўсё атрымаць: як заўсёды, самае дарагое для «Звязды» — роднае слова. Беларускія словы сталі гучаць часцей — і падарункаў станавілася ўсё менш і менш. Прыемна, што беларускаму «Дзякуй» з вялікім задавальненнем навучылася жанчына з Калінінграда, якая, відаць, завітала сюды да знаёмых. А даўнія падпісчыкі газеты і тыя, хто хацеў афарміць падпіску на «Звязду» адразу на плошчы (дапамагчы ў гэтым у любую хвіліну былі гатовыя работнікі Чашніцкай пошты, што ўвесь час былі побач), маглі атрымаць фірмовую кепку ці футболку, а можа, і шыкоўны кубачак.

СТАР. 3

Супрацоўнікі чашніцкай пошты.

ДЫК ПЛАТНЫ ЦІ БЯСПЛАТНЫ ПРАЕЗД ДЛЯ СТУДЭНТАЎ?

Пакуль такой законнай падставы ў іх няма

Зраніцы панядзелка слоўныя баталіі разгарнуліся спачатку ў сталічным пасажырскім транспарце паміж студэнтамі і кандуктарамі, а неўзабаве перакінуліся ў інтэрнэт. І ў першым, і ў другім выпадках абмяркоўвалася: чаму з маладых людзей патрабуюць аплачваць праезд, калі днямі было абвешчана, што для студэнтаў дзённай формы навучання ён стане бясплатным...

Нагадаем перадгісторыю. Старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька ў эфіры праграмы на тэлеканале «РТР-Беларусь» сказаў, што з 12 верасня гэтая катэгорыя студэнтаў зможа бясплатна карыстацца грамадскім транспартам — па студэнцкім білеце. Студэнтам-завочнікам такой прэферэнцыі не давалася. Пры гэтым мэр спасылаўся на даручэнне кіраўніка дзяржавы наконт распаўсюджвання сістэмы бясплатнага праезду для студэнтаў дзённай формы навучання, якое той зрабіў падчас мерапрыемстваў па адкрыцці аўтавакзала «Цэнтральны».

Аднак, як высветлілася, кандуктары цалкам справядліва патрабавалі ад студэнтаў аплаты імі праезду: ніякіх афіцыйных дакументаў аб прадастаўленні такой ільготы раніцай панядзелка не было. Больш за тое, як высветліў карэспандэнт «Звязды», не з'явіліся яны і ў другой палове дня. У дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс» адразу параілі звяртацца па ўдакладненні на наступны дзень, маўляў, у панядзелак наўрад ці што мы пачуем станоўчае па гэтым пытанні. Перыядычна тэлефанаваць да канца дня прапанавалі і ў прэс-службе Мінгарвыканкама: акрамя інфармацыі, распаўсюджанай дагэтуль, тут таксама не маглі дадаць нешта новае. Нарэшце бліжэй да канца працоўнага дня ў прэс-службе «Звяздзе» сказалі літаральна наступнае наконт бясплатнага праезду студэнтаў у гарадскім пасажырскім транспарце: «Ёсць даручэнне старшыні гарвыканкама. Гэтае пытанне прапрацоўваецца. Трэба правесці неабходныя падлікі. Зразумейце, што гэта справа не аднаго дня. Трэба звязацца асабіста з дырэктарам прадпрыемства «Мінскгранс». На жаль, ён не адказвае па мабільным тэлефоне — тэлефануем яму на працягу дня. Увогуле трэба, каб з'явіўся нарматыўны дакумент, каб рашэнне пра бясплатны праезд уступіла ў сілу. Як хутка тое можа адбыцца? Напішыце, што цягам бліжэйшых дзён. Як толькі з'явіцца якая-небудзь інфармацыя, мы тут жа яе распаўсюдзім».

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», як жа зараз ездзіць у сталічным пасажырскім транспарце студэнтам дзённай формы навучання, суразмоўца заўважыла, што толькі з аплатай праезду. Паколькі не быў апублікаваны дакумент аб прадастаўленні гэтай катэгорыі грамадзян ільготы, для бясплатнага праезду няма ніякіх законных падстаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ВЕТРАНА, А НА ВЫХАДНЫЯ ЯШЧЭ І ПАХАЛАДАЕ

На гэтым тыдні на тэрыторыю Беларусі будуць паступаць паветраныя масы з боку Заходняй Еўропы, якія зацягнуць у краіну атлантычны цыклон і халад Нарвежскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У аўторак краіна трапіць у зону паніжанага ціску, таму месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ад 17 на поўначы да 24 цяпла на поўдні краіны. У сераду і чацвер кароткачасовыя дажджы магчымыя толькі ў паўночным рэгіёне. Усталюецца парывісты паўднёва-заходні вецер. Тэмпература ўначы 7—13, удзень у сераду — 16—23, а ў чацвер стане крыху халадней — 14—21 градус.

Ужо ў пятніцу ў Беларусь завітае яшчэ халаднейшае паветра з боку Скандынаўскіх краін. Месцамі па поўначы чакаюцца невялікія дажджы. Тэмпература ўначы будзе 5—11, у пятніцу ўдзень усяго 12—18 градусаў.

Паводле папярэдніх падлікаў, у выхадныя атмасферны ціск пачне павялічвацца, аднак месцамі яшчэ магчымы невялікі дождж. Уначы будзе ўжо сапраўды холадна — 3—10 цяпла, а **пры праясненнях на тарфяніках Палесся магчымы нават невялікія замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў.** Удзень будзе параўнальна камфортна — 12—18, у нядзелю ў Брэсцкай вобласці да 20 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

З 14 ВЕРАСНЯ СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ДА 30 ПРАЦЭНТАЎ ГАДАВЫХ

Пра гэта паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка.

«Гэты захад ажыццяўляецца напярэдадні адкрыцця дадатковай сесіі таргоў на Беларускай валютна-фондавай біржы і з'яўляецца важным элементам агульнаэканамічнай палітыкі, накіраванай на стабілізацыю сітуацыі на валютным рынку і фінансавае аздараўленне эканомікі ў цэлым, — патлумачыў прадстаўнік упраўлення інфармацыі. — Паслядоўнае павышэнне кошту пазыковых грошай у эканоміцы будзе аказваць стрымальнае ўздзеянне на попыт банкаўскіх кліентаў на крэдытныя рэсурсы на перыяд выхаду на адзіны курс».

Акрамя таго, гэтае павелічэнне стане дадатковым фактарам стымулявання зберажэння ў беларускіх рублях і зніжэння ціску на абменны курс.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ПАЖАР У «ДУДУТКАХ». ПРЫЧЫНЫ ВЫСВЯТЛЯЮЦЦА

У суботу ў 20.38 у МНС патэлефанаваў вартаўнік музейнага комплексу «Дудуткі» і паведаміў, што ў будынку пажар.

Калі падраздзяленні пажарных-выратавальнікаў прыбылі на месца, будынак практычна цалкам быў ахоплены агнём. Работнікі музея паспелі эвакуяваць наведнікаў кавярні, вывезлі з гаража 10 аўтамабіляў. На гэтым пажары працавала 15 адзінак спецыяльнай тэхнікі, што дазволіла лакалізаваць яго і абмежаваць матэрыяльны ўрон. Пажар быў ліквідаваны ў 23.18. Пацярпелых не было, аднак агонь знішчыў дах і драўлянае столевае перакрыццё на плошчы каля 600 квадратных метраў. Памяшканні, якія знаходзіліся на першым паверсе, выгаралі знутры, як і этнаграфічная галерэя на другім. Зараз высвятляюцца прычыны пажару.

Так сцісла пра здарэнне паведамляе сайт Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Рэдакцыя паспрабавала ўдакладніць інфармацыю пра пажар у музейным комплексе, тым больш што ў інтэрнэце пачалі гаварыць пра версіі яго ўзнікнення.

Як паведаміў нам галоўны спецыяліст цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Аляксей РАК, матэрыяльны ўрон, нанесены будынку музея, складае каля 200 мільёнаў рублёў, прычым матэрыяльных каштоўнасцяў было выратавана на 213 мільёнаў. Улічваючы месца здарэння, суразмоўца заклікаў не спяшацца з высновамі адносна прычыны пажару. Паводле яго слоў, матэрыялы накіраваныя на экспертызу, што некалькі пазней дазволіць дакладна расказаць пра іх. Зараз таксама працуе спецыяльная камісія, якая ўдакладняе памеры нанесенага агнём урону.

ГАРЭЎ ДАХ ЦАРКВЫ

Пра тое, што гарыць дах царквы ў вёсцы Ніўкі Добрушскага раёна, пажарным-выратавальнікам паведаміў відавочца. Здарэнне адбылося ў нядзелю ў 14.35.

На шчасце, людзей у гэты момант у будынку не было: ранішняя служба праводзілася з дзевяці раніцы да апоўдня. Пажар лакалізавалі ў 15.15, а праз дваццаць хвілін — ліквідавалі. Агонь паспеў знішчыць дах на плошчы 30 квадратных метраў і 50 квадратных метраў драўлянай абрашоткі. Сам будынак і большую частку матэрыяльных каштоўнасцяў выратавалі. Прычына пажару высвятляецца. Мяркуецца, што адбылося кароткае замыканне электраправодкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Больш увагі спажывецкаму рынку

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паводле слоў прэм'ер-міністра, у гарбарнай галіне Беларусі сёння нямала праблем. «Неабходна выходзіць на якасныя тавары для нашай абутковай прамысловасці, адзначыў кіраўнік урада. — Тое, што ідзе гарбарная сыравіна для мэблі і іншых вырабаў, гэта таксама трэба, але ў першую чаргу мы павінны закрыць патрэбнасці нашай абутковай прамысловасці». Паводле слоў прэм'ер-міністра, такая задача пастаўлена перад Бабруйскім камбінатам, прадпрыемствам «Гатава», а таксама Гродзенскім гарбарным заводам, які цяпер актыўна вядзе перагаворы аб супрацоўніцтве з адной з іспанскіх кампаній. «Такім чынам мы сваю абутковую прамысловасць закрыем якаснымі вырабамі, а тое, што сёння гандаль ажыццяўляе сырымі шкурамі за бясцэнак — нікуды не варта, гэта трэба спыняць», — падкрэсліў ён.

Прэм'ер-міністр таксама закрануў праблемы, якія існуюць на прадпрыемствах лёгкай прамысловасці. Паводле слоў кіраўніка ўрада, у бліжэйшы час будуць прыняты некаторыя сур'ёзныя меры па навядзенні парадку ў галіне. «Мы ў гэтым годзе зрушым з мёртвага пункта Баранавіцкі баваўняны камбінат і «Камволь», — расказаў Міхаіл Мясніковіч. — Гэта вельмі праблемныя прадпрыемствы, мы забяспечым іх рэальнае развіццё». Прэм'ер-міністр дадаў, што заслухаў ужо справаздачу кіраўніка канцэрна «Беллегпрам» па гэтых пытаннях і даручыў актыўна і хутка вырашаць праблемы, якія стаяць перад галіной.

На думку Міхаіла Мясніковіча, беларускія трыкатажныя вырабы могуць паспяхова канкурыраваць з імпартнымі. «Па швейных вырабах няма праблем, па трыкатажных — тым больш. Тут і вельмі высокая якасць, і вялікі попыт на рынках Мытнага саюза», — падкрэсліў кіраўнік урада.

У МЕТРО ПАД ЦЯГНІК УПАЛА ЖАНЧЫНА

Учора ў сталічным метро пад цягнік упала 60-гадовая жанчына.

Як паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама, 12 верасня ў 14.50 на станцыі метро «Фрунзенская» 60-гадовай жанчыне стала дрэнна і яна ўпала пад састаў, які прыбываў да платформы. Жанчына засталася жывой, з пераломам рукі яна дастаўлена ў адну з клінік Мінска. Рух цягнікоў быў адноўлены, затрымка склала 18 хвілін. Вядзецца праверка, якая высветліць усе абставіны здарэння.

Алена КРАВЕЦ.

У АВАРЫІ Ў МІНСКУ ПАШКОДЖАНА 5 МАШЫН

Учора каля 9 гадзін раніцы на вуліцы Уральскай у сталіцы адбылося ДТЗ, у якім пацярпела 5 аўтамабіляў, а двое кіроўцаў змешчана ў бальніцу.

Як паведаміла старшы інспектар па АіП АДАІ Партызанскага РУУС Тацяна Таляронак, кіроўца аўтамабіля «Таёта Карола» на вялікай хуткасці пратараніў «Рэно Меган», але не спыніўся і паехаў далей. Убачыўшы вялікі паток машын у спадарожным кірунку, ён выехаў на сустрэчную паласу. Там і адбылося лабавое сутыкненне з яшчэ адным «Рэно». Ад удару «Таёта» перакулілася на дах, а затым зноў стала на колы, зачапіўшы пры гэтым таксі, якое праязджала міма.

У «Рэно» ад лабавога сутыкнення пацярпела 28-гадовая дзяўчына, якая знаходзілася за рулём. З аўтамабіля яе выразалі выратавальнікі, у цяжкім стане яна дастаўлена ў бальніцу. Шпіталізаваны і кіроўца «Таёты». Ці быў ён п'яным, высветліць следства.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

НЕ СПАЦЬ ЗА РУЛЁМ

10 верасня ў Чавускім раёне раніцай адбылася аварыя, у выніку якой была смяротна траўмавана 56-гадовая жанчына.

Гэтай жыхарцы Віцебска трэба было ў Касцюковічы, і яна папрасіла 19-гадовага сына сваёй сяброўкі адвезці яе ў памежны райцэнтр. У маладога чалавека ёсць толькі 1,5 года вадзіцельскага стажу, і за руль мікрааўтобуса «Форд Транзіт» ён, калі шчыра, сеў не вельмі ахвотна.

Фота Магілёўскай ДАІ.

Так здарылася, што каля 5 гадзін раніцы ля вёскі Рымінка мікрааўтобус сутыкнуўся з «масквічом», які спыніўся на абочыне. У выніку сутыкнення муж з жонкай з «масквіча», якія накіроўваліся на хаўтуры ў Расію, не пацярпелі. А вось «Форд Транзіт» перакуліўся, і пасажырка, якая не была прышпілена рэменем бяспекі, вылецела праз лабавое шкло. Жанчына атрымала траўму галавы і з ацёкам галаўнога мозга была ў беспрытомным стане шпіталізавана ў раённую бальніцу, дзе, нягледзячы на высілкі урачоў, праз восем гадзін памерла.

— Па гэтым факце яшчэ праводзіцца праверка, але кіроўца «форда» сказаў, што ён заснуў і страціў кантроль над кіраваннем аўтамабіля, — пракаментавала інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ Магілёўскага УУС Вольга Вяршубская. — Мы просім усіх кіроўцаў у любы час сутак уліч-ваць абстаноўку на дарозе і разлічваць свае сілы за рулём аўтамабіля.

Ілона ІВАНОВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НА АЭС «МАРКУЛЬ» У ФРАНЦЫІ АДБЫЎСЯ ВЫБУХ

У выніку інцыдэнту адзін чалавек загінуў, прынамсі чатыры пацярпелі, паведамляецца таксама пра аднаго, які знік без вестак.

Па звестках Le Figaro і шэрагу іншых крыніц, на АЭС існуе рызыка ўцечкі радыяцыі. Выбух адбыўся каля 11:45 па мясцовым часе (14:45 па беларускім) у адной з печаў пасля ўзгарання на пляцоўцы для захоўвання радыеактыўных адходаў. Месца здарэння ачэплена, на тэрыторыі АЭС працуюць пажарныя, паліцыя, медыкі. Атамная электрастанцыя «Маркуль» была ўведзеная ў эксплуатацыю ў студзені 1956 года. АЭС абсталяваная трыма рэактарамі, якія працуюць на ўранавым паліве.

МЕДЫКІ РАСПРАЦАВАЛІ СУПЕРРАЦЫЁН ДЛЯ ТЫХ, КАМУ ЗА 40

Каб прадухіліць развіццё шматлікіх захворванняў, спалучаных са сталым узростам, трэба прытрымлівацца адмысловай дыеты, раяць амерыканскія ўрачы. Правільны набор прадуктаў харчавання засцеражэ ад астэапарозу, сардэчных хвароб, рака грудзей і дапаможа справіцца з сімптомамі клімаксу.

На партале FOX News апублікаваны той самы «правільны» спіс. У яго ўвайшлі памідоры чэры, якія змяшчаюць лікапін — ён абараняе ад акісляльнага стрэсу. Яны таксама памяншаюць верагоднасць рака грудзей, шыйкі маткі і сардэчных хвароб. Далей па спісе ідзе льняное насенне з яго поліненасычанымі тлустымі кіслотамі амега-3 і лігнінамі, якія ўваходзяць у састаў абалонкі. Усё гэта дае паніжэнне ўзроўню халестэрыну. Каб захаваць зрок, умацаваць імунітэт і косці, прадухіліўшы астэапароз і звязаныя з ім пераломы, даследчыкі раяць звярнуць увагу на капуснае лісце. Яно змяшчае карысны бялок лютэін, вітамін С, кальцый і вітамін К. Багаты вітамінам С і іншымі антыаксідантамі і журавінавы сок. Сакрэт здаровай нервовай сістэмы, нармальнага ўзроўню эстрагену пасля 40 гадоў і адсутнасці паслядродавай дэпрэсіі — лосось, сёмга, гарбуша. А для паніжэння рызыкі дыябету, паляпшэння тургору мышачнай тканкі і тармажэння працэсу старэння варта ўключыць у рацыён ёгурт, выраблены з авечага малака. Ён багаты бялком і амаль не змяшчае цукру. І апошні пункт — грэцкія арэхі. Яны абароняць ад рака грудзей і астэапарозу. Паводле апошніх даследаванняў, калі ўжываць штодня 50 грамаў арэхаў, то ўдасца стрымаць рост ракавых клетак у арганізме і захаваць моц і здароўе касцей.

Уведомление о созыве внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Старая фабрика»

Наблюдательный совет ОАО «Старая фабрика» извещает акционеров Общества о проведении внеочередного общего собрания акционеров.

Собрание состоится 23 сентября 2011 года в 10.00 в помещении Общества по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 19.

Повестка дня:

1. О выкупе акций у акционеров на баланс Общества с целью дальнейшего аннулирования.
2. О вопросе подготовки проектно-сметной документации и других документов по реконструкции административного здания.
3. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета.

Регистрация участников собрания будет проводиться в день проведения собрания с 9.30 до 10.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность, представителю акционера -- доверенность и документ, удостоверяющий личность.

Наблюдательный совет ОАО «Старая фабрика».

УНП 100640022

Уладзімір ЗДАНОВІЧ:

«НЕ ТРЭБА БАЯЦЦА, ШТО АДЛІЧЭННІ СА ШКОЛ МОГУЦЬ СТАЦЬ МАСАВЫМІ...»

«Кодэкс аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, які ўступіў у дзеянне з 1 верасня, утрымлівае механізмы для абароны малакамплектных сельскіх школ ад іх неабгрунтаванага закрыцця», — аб гэтым заявіў падчас відэабрыфінгу на інфармацыйна-аналітычным партале Саюзнай дзяржавы старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір ЗДАНОВІЧ:

— Безумоўна, мясцовым уладам прасцей закрыць сельскую школу, чым несці выдаткі на навучанне вясковых дзяцей, аднак цяпер рашэнне аб ліквідацыі дзяржаўнай установы агульнай сярэдняй адукацыі будзе прымацца з улікам дэмаграфічных перспектыў канкрэтнага рэгіёна: колькасці дзяцей дашкольнага ўзросту і колькасці дзяржаўных устаноў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі на гэтай тэрыторыі. Прычым рашэнні аб рэарганізацыі і ліквідацыі ўстаноў адукацыі будуць прымацца іх заснавальнікамі толькі па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі.

У Кодэксе былі замацаваны наступныя тыпы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі: пачатковая, базавая, сярэдняя школа, вячэрняя школа, гімназія, гімназія-інтэрнат, ліцэй, спецыялізаваны ліцэй, суворaўскае вучылішча, кадэцкае вучылішча, школа-інтэрнат для дзяцей сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі, санаторная школа-інтэрнат, вучэбна-педагагічны комплекс, міжшкольны вучэбна-вытворчы камбінат працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі і міжшкольны цэнтр дапрызыўнай падрыхтоўкі.

Уладзімір Зданoвіч расказаў, што пры рабоце над Кодэксам было шмат спрэчак наконт таго, з якога ўсё ж такі ўзросту беларускія дзеці павінны ісці ў школу. У выніку спыніліся на ўзросце шэсць і больш гадоў. Але

Па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў будучага вучня дапускаецца прыём у першы клас дзіцяці, якому шэсць гадоў спаўняецца ў перыяд з 1 па 30 верасня адпаведнага навучальнага года.

што рабіць, калі дзіцяці спаўняецца шэсць гадоў, напрыклад, у верасні ці ў кастрычніку? У Кодэкс увайшла наступная норма: па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў будучага вучня дапускаецца прыём у першы клас дзіцяці, якому шэсць гадоў спаўняецца ў перыяд з 1 па 30 верасня адпаведнага навучальнага года.

Закрануў у сваёй прамове дэпутат і дысцыплінарную адказнасць удзельнікаў адукацыйнага працэсу, якая была заканадаўча замацавана ўпершыню:

— Мы палічылі, што апошнім часам уся ўвага была сканцэнтравана выключна на правах дзіцяці. Аднак сапраўдным грамадзянінам можа быць толькі той, хто добра ведае не толькі свае правы, але і абавязкі, а таксама нясе адказнасць за свае словы і ўчынкі. Дысцыплінарная адказнасць будзе наступаць з 14 гадоў. Падставамі для прыцягнення да яе могуць быць спазненні і пропускі заняткаў, парушэнні дысцыпліны падчас заняткаў, абразы ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, псаванне маёмасці, курэнне на тэрыторыі ўстановы адукацыі, ужыванне наркатычных рэчываў ці алкагольных напіткаў. А меры пакарання — заўвага, вымова ці нават адлічэнне. Аднак паколькі базавая адукацыя з'яўляецца ў нашай краіне абавязковай, то адлічыць вучня з базавай школы будзе немагчыма. Адлічэнне пагражае толькі падлеткам з 16-гадовага ўзросту. Але не трэба баяцца, што адлічэнні могуць стаць масавымі, а настаўнікі атрымаюць магчымасць такім чынам помсціць нелюбімым вучням. **Для таго, каб быць выключаным са школы, вучню трэба будзе вельмі моцна «пастарацца».** Адлічыць могуць за адсутнасць на занятках больш як трыццаць дзён без уважлівай прычыны, за паўторнае сістэматычнае невыкананне абавязкаў ці неналежнае выкананне абавязкаў навучэнцам, да якога ўжо прымяняліся меры дысцыплінарнага спагнання. Яшчэ адна падстава — тры гадавыя адзнакі «нуль». Рашэнне аб адлічэнні таго ці іншага вучня абавязкова будзе прымацца на Савеце школы з удзелам бацькоўскага камітэта і камісіі па справах няпоўнагадовых. Хачу заспакоіць, што пасля адлічэння малады чалавек не застанецца на вуліцы, а будзе адпраўлены ў абавязковым парадку на курсы прафесійнай падрыхтоўкі. Паверце, што нам дарагі лёс кожнага маладога чалавека, аднак прэвентыўныя меры ўсё ж такі павінны прысутнічаць у нашым заканадаўстве.

Уладзімір Зданoвіч паведаміў, што ўсе ўстановы адукацыі сталі пасля ўступлення ў дзеянне Кодэкса аб адукацыі зонамі, свабоднымі ад курэння. Шчыра кажучы, ад некаторых кіраўнікоў ВНУ гучалі прапановы захаваць там спецыяльныя месцы для курцоў, аднак мы іх не падтрымалі», — дадаў парламентарый.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У МІНСКУ РАЗВІТАЛІСЯ З БЕЛАРУСАМІ, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ Ў АВІЯКАТАСТРОФЕ ПАД ЯРАСЛАЎЛЕМ

У выхадныя ў Мінску былі пахаваны трое беларусаў, што загінулі ў авіякатастрофе пад Яраслаўлем, — капітан нашай хакейнай зборнай 36-гадовы Руслан Салей, 21-гадовы Сяргей Астапчук і 31-гадовы трэнер па фізпадрыхтоўцы Мікалай Крываносаў.

У суботу мінчане развітваліся з найлепшым гульцом у гісторыі беларускага хакея Русланам Салеем. Жалобная цырымонія праходзіла на катку хакейнага клуба «Юнацтва» ў парку Горкага. У парку былі адмененыя ўрачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню горада, працавалі толькі атракцыёны. Ужо за гадзіну да цырымоніі людзі неслі кветкі да лядовай арэны.

Зачыненая труна была выстаўлена ў фае палаца, на ёй — майка «Анахайма», якому Руслан аддаў дзесяць гадоў, і шалік КХЛ, дзе яму не наканавана было выступіць. Побач з труной — ганаровая варта і мноства вянкоў: ад Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, Кантынентальнай хакейнай лігі, Нацыянальнага алімпійскага камітэта, Міністэрства спорту, сваякоў і блізкіх, балельшчыкаў. Развітацца з сябрам прыехалі беларускія хакеісты з Амерыкі і Расіі — Міхаіл Грабоўскі і браты Касціцыны, Аляксей Калюжны, у поўным складзе былі каманды «Дынама-Мінск» і «Юнацтва». Побач з труной знаходзіліся бацькі Руслана, старэйшы брат Вадзім з сям'ёй, сястра.

Замест дзвюх гадзін жалобная цырымонія падоўжылася да трох — такія вялізным быў паток людзей, якія прыйшлі развітацца. Руслана Салея пахавалі на Маскоўскіх могілках, непадалёк ад таго месца, дзе пахаваны Уладзімір Мулявін. На магіле хакеіста зараз стаіць драўляны праваслаўны крыж, вянкі і каляровы партрэт.

Сяргей Астапчук і Мікалай Крываносаў былі пахаваныя ў нядзелю. Развітанне з Сяргеем Астапчуком праходзіла ў рытуальнай зале па вуліцы Альшэўскага ў Мінску. Праводзіць у апошні шлях хакеіста прыехалі яго сябры з Расіі, а таксама цэлы аўтобус з Наваполацка — трэнеры, у якіх Сяргей пачынаў гуляць у хакей, і хакеісты, з якімі калісьці ён разам займаўся. У хакеіста засталіся маці, бабуля і сястра.

З трэнерам па фізпадрыхтоўцы «Лакаматыва» развітваліся ў яго кватэры па вуліцы Піянерскай у Мінску. Так пажадалі яго блізкія. Некалькі дзясяткаў чалавек прынеслі вянкі і жывыя кветкі. Труну выносілі з дома пад суправаджэнне ваеннага аркестра. Пахавалі Мікалая Крываносава і Сяргея Астапчука на Кальварыйскіх могілках у сталіцы.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

P.S. ***Як стала вядома ўчора, у апёкавым цэнтры Інстытута хірургіі імя Вішнеўскага ў Маскве памёр хакеіст Аляксандр Галімаў, які быў адным з двух чалавек, якім удалося выжыць падчас падзення самалёта пад Яраслаўлем. «Раніцай 12 верасня, нягледзячы на тэрапію з выкарыстаннем усіх сучасных метадаў лячэння, памёр Аляксандр Галімаў», — паведамляе РИА Новости.***

Бортінжынер Аляксандр Сізаў з рэанімацыі пераведзены ў агульную палату. Ён знаходзіцца ў Інстытуце Скліфасоўскага ў Маскве.

Фота БЕЛТА.

11 ВЕРАСНЯ: 10 ГАДОЎ ПАСЛЯ

Ёсць такія рэчы ў жыцці, пра якія можна сказаць толькі лічбамі

Гнаць, як Шумахер, учыніць патоп і нешта адксерыць — ёсць мноства імёнаў, з'яў, брэндаў, якія сталі хадзячымі назвамі. І толькі адна дата — 11 верасня. Ну, а як інакш называць трагедыю, для якой так і не знайшлося слоў, колькі кніг не напішы і колькі фільмаў не здымі?! Учыненае ў гэты дзень 10 гадоў таму змяніла свет і людзей, якія яго насяляюць. З таго дня з'явіўся агульны, глабальны вораг — тэрарызм. Самыя жудасныя мажлівыя пагрозы сталі рэальнасцю. Спрэчныя акалічнасці аналізуюцца дагэтуль. Цэласнай карціны няма і пасля шматлікіх афіцыйных ды незалежных расследаванняў. Не прэтэндуючы на пэўнасць, прывядзём афіцыйную фабулу.

19 тэрарыстаў на чатырох захопленых пасажырскіх самалётах нанеслі скрышальны ўдар па самым, здавалася б, няўразлівым — апоры росквіту і самаўпэўненасці. Два самалёты паразілі вежы Сусветнага гандлёвага цэнтра, мэтай трэцяга стаў Пентагон. Экіпаж і пасажыры чацвёртага спрабавалі перахапіць кіраванне ў тэрарыстаў, лайнер ўпаў у полі. Тры тысячы загінулых, амаль удвая больш параненых, ураджэнцаў 92 краін свету. Трагедыя сусветнага маштабу — ва ўсіх сэнсах. А колькасць тых, хто пацярпеў не фізічна, — проста невымерная. 11 верасня стала сінонімам, калі не сімвалам тэрору.

Новы ўклад жыцця з'явіўся не толькі ў адной пацярпелай краіне, якая перакроіла сваю знешнюю палітыку. Многія дзяржавы ў розных паўшар'ях тады адрэагавалі спагадай і салідарнасцю. Выразнікам агульнага настрою стала французская Le Monde з загаловкам «Сёння ўсе мы амерыканцы».

Прыкметны і практычны эфект перамен. У многіх краінах былі распрацаваныя і прынятыя антытэрарыстычныя змены ў заканадаўстве, якія закраналі самыя розныя сферы дзейнасці: ад транспартнага аж да банкаўскага сектара. Каб, крый Божа, не дапамагчы ліхадзеям акумуляваць і пераводзіць грошы на сваю чорную справу. Акцэнт на працу праваахоўнікаў быў надзвычай узмоцнены.

Ва ўсіх гэтых наступстваў ёсць як прыхільнікі, так і апаненты. Можна ўсяляк ацэньваць гэтую гістарычную вяху: як канец эры спакою і дабрабыту, як пачатак эры перманентнай вайны. Можна рабіць розныя высновы 10 гадоў пасля: што зло адпомшчанае, а вінаваты забіты. Або што вайна прайграная, рэсурсы растрачаныя, а на падыходзе новы калапс — на гэты раз эканамічны. Так ці інакш, самы, бадай, галоўны набытак гэтага сусветнага змагання з нябачным ворагам — пільнасць ды імкненне цаніць жыццё. Нікому гэта сёння не пашкодзіць.

Зоя ВАРАНЦОВА.

НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ

Рэха Вялікай Айчыннай вайны адгукаецца і цяпер. Летам на аб'язной дарозе за Нясвіжам (Мінская вобласць) былі знойдзены астанкі пяці чырвонаармейцаў і тры капсулы.

Як высветлілася ў ходзе даследаванняў, салдаты загінулі ў ліпені 1941 года пры абароне Нясвіжа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Імя аднаго ўдалося ўстанавіць: гэта былы вайсковец Баранавіцкай часці Міхаіл Паўлавіч Кругавы, які нарадзіўся ў 1921 годзе ў Курскай вобласці (Расія). Імёны астатніх салдат устанавіць не ўдалося. Учора на брацкай магіле ў Нясвіжы астанкі чырвонаармейцаў былі ўрачыста перазахаваныя, ля Вечнага агню адбыўся мітынг з удзелам старшыні райвыканкама Івана Крупко. Воіны Баранавіцкай камендатуры далі развітальны залп у гонар абаронцаў горада, і пад гукі аркестра астанкі чырвонаармейцаў былі апушчаны ў брацкую магілу.

Раіса ХВІР.

РАСХОДАВАННЕ БЮДЖЭТНЫХ СРОДКАЎ — НА КАНТРОЛІ

У Кіеве адбылася XI сесія Савета кіраўнікоў вышэйшых органаў фінансавага кантролю дзяржаўудзельніц СНД. Удзел у пасяджэнні прыняла і дэлегацыя дзяржаўнага кантролю Беларусі.

На пасяджэнні разглядалася пытанне кантролю за выкарыстаннем дзяржаўных сродкаў, якія выдзяляюцца на папярэджанне і ліквідацыю наступстваў прыродных і тэхнагенных катастроф. Старшыня КДК Беларусі Аляксандр Якабсон адзначыў, што з 1990 года ў Беларусі рэалізаваны ўжо чатыры дзяржаўныя праграмы пераадолення наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Сёлета пачата рэалізацыя пятай праграмы. Паводле яго слоў, пытанні мэтавага і эфектыўнага расходавання бюджэтных сродкаў, выдзеленых на ліквідацыю наступстваў чарнобыльскай катастрофы, знаходзяцца на пастаянным кантролі КДК.

У межах сустрэчы старшыня КДК Беларусі і старшыня Падліковай камісіі Кыргызскай Рэспублікі падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве паміж вышэйшымі органамі фінансавага кантролю. Яно прадугледжвае абмен вопытам у вобласці метадалогіі і парадку ажыццяўлення дзяржаўнага аўдыту і фінансавага кантролю, узаемадзеянне ў сферы прафесійнага навучання і павышэння кваліфікацыі кадраў, правядзенне сумесных даследаванняў.

У той жа дзень кіраўнікі кантрольных ведамстваў Беларусі, Расіі і Казахстана падпісалі мемарандум аб выніках трохбаковай паралельнай праверкі выканання мерапрыемстваў па фарміраванні Мытнага саюза, падрыхтоўцы і рэалізацыі дакументаў, якія рэгулююць узаемадзеянне паміж трыма краінамі.

Надзея ДРЫЛА.

Минский районный исполнительный комитет 13 октября 2011 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 49	623680602601000886	0,1496 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 174 713	168 000 000	16 800 000
2	Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 50	623680602601000884	0,1509 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 174 713	169 000 000	16 900 000
3	Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 68	623680602601000888	0,1476 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 174 713	165 000 000	16 500 000
4	Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 69	623680602601000887	0,1476 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 174 713	165 000 000	16 500 000
5	Боровлянский с/с, д. Дроздово, участок № 70	623680602601000885	0,1513 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 174 713	169 000 000	16 900 000
6	Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 93	623680604601000704	0,1605 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 952 590	75 000 000	7 500 000
7	Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 104	623680604601000702	0,1550 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 952 590	72 000 000	7 200 000
8	Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 117	623680604601000701	0,1642 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 952 590	76 000 000	7 600 000
9	Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 125	623680604601000703	0,1604 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 952 590	74 000 000	7 400 000
10	Острошицко-Городокский с/с, д. Новоселки, участок № 6	623685205101000262	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 558 356	30 000 000	3 000 000
11	Острошицко-Городокский с/с, д. Новоселки, участок № 7	623685205101000263	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 558 356	30 000 000	3 000 000
12	Острошицко-Городокский с/с, д. Новоселки, участок № 8	623685205101000264	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 558 356	30 000 000	3 000 000
13	Острошицко-Городокский с/с, д. Новоселки, участок № 9	623685205101000265	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 558 356	30 000 000	3 000 000
14	Папернянский с/с, д. Цнянка	623685512101000039	0,1502 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 441 190	28 000 000	2 800 000
15	Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 31	623685505101000341	0,1481 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 214 870	42 000 000	4 200 000
16	Сеницкий с/с, д. Щитомиричи, участок № 134	623686607101000264	0,1353 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 225 080	41 000 000	4 100 000
17	Сеницкий с/с, д. Щитомиричи, участок № 153	623686607101000387	0,1420 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 197 980	43 000 000	4 300 000
18	Сеницкий с/с, аг. Атолино, участок № 61	623686600601000434	0,1464 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 286 980	31 000 000	3 100 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **13.10.2011 г.** в 9.45. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **07.10.2011 г.** в 17.00. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–9 перечисляется на расчетный счет № 3600621010037 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лоты 10–13 перечисляется на расчетный счет № 3641000000047 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600208279, код платежа – 04901.

На Лоты 14–15 перечисляется на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На Лоты 16–18 перечисляется на расчетный счет № 3641900000134 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.
2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.
3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

МІНСКУ — 944: асілкі, графіці, вулічныя музыкі...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Між іншым на дзівосы мінчане і госці сталіцы ўсё ж паглядзелі. На пляцоўцы ля Палаца спорту прайшлі конкурсы майстроў графіці і асілкаў. Апошнія, дарэчы, вельмі спадабаліся прысутным. Яшчэ б: здаровыя мужчыны цягалі калодкі вагой да 140 кг і падымалі камяні да 160 кг...

Але, бадай, самае цікавае абяцалася ў Траецкім прадмесці. На фестываль вулічных музыкаў людзі ішлі натоўпам. Агнявое шоу на беразе Свіслачы дапаўнялася гукамі дуды, якія, час ад часу пераклікаліся з гітарнымі акордамі. Асабліва людна тут было пад вечар. Складвалася ўражанне, што сюды сабралася палова Мінска.

